Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Прарэктар па вучэбнай рабоце БДУКМ
____________________ С.Л.Шпарло
«24» _____10_______2022 г.
Рэгістрацыйны № ВД- 447 /эвуч.

# ЭТНАМУЗЫКАЛОГІЯ

Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі
па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці
*1-18 01 01 Народная творчасць па напрамку (напрамках),*
*напрамку спецыяльнасці 1-18 01 01-05 Народная творчасць (фальклор),*
*спецыялізацыі 1-18 01 01-05-01 Этнафоназнаўства*

2022

Вучэбная праграма складзена на аснове адукацыйнага стандарту вышэйшай адукацыі I ступені па спецыяьнасці 1-18 01 01 Народная творчасць (па напрамках), зацверджаных пастановай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 12 красавіка 2022 г. № 78, вучэбных планаў БДУКМ па напрамку спецыяльнасці спецыялізацыі

**СКЛАДАЛЬНІК:**
*Э.В.Шчадрына,* старшы выкладчык кафедры народна-песеннай творчасці і фальклору ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтва.

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**
*Н.В.Петухова*, завгадчык кафедры рэжысуры ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат педагагічных навук;
*Н.У.Касцяневіч,* загадчык аддзяленнем народнай творчасці дзіцячай установы адукацыі “Цэнтр дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі “Ветразь” г.Мінска, педагог дадатковай адукацыі, кіраўнік фальклорнага калектыва “Мілавіца”.

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**
*кафедрай* народна-песеннай творчасці і фальклору ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў (пратакол № 10 ад 24.05.2022);
*прэзідыумам* навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў” (пратакол № 5 ад 15.06.2022).

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбная дысцыпліна «Этнамузыкалогія» складаецца з і трох раздзелаў: «Беларуская этнамузыкалогія», «Этнамузыкалагічны практыкум» і «Асноўныя мелодыка-рытмічныя тыпы беларускіх народных абрадавых песень і арэалы іх бытавання». Яна цесна звязана з такімі вучэбнымі дысцыплінамі як: «Тэорыя фальклору», «Этнафанічны практыкум», «Клас фальклорнага выканальніцкага майстэрства», «Уводзіны ў беларускую спеўную этнафонію», «Методыка арганізацыі фальклорнай дзейнасці» і інш.

*Мэта вучэбнай дысцыпліны* «Этнамузыкалогія» – фарміраванне сістэмы ведаў студэнтаў аб тэарэтычных асновах, навуковых напрамках і метадах вывучэння народнай традыцыйнай музычнай культуры, якія дазваляюць раскрыць сістэму абумоўленасці, сувязі з'яў музычнага фальклору з кантэкстам і формамі культурнай традыцыі.

*Задачы вучэбнай дысцыпліны:*

– выяўленне спецыфікі этнамузыкалогіі як навукі, інтэгруючай розныя аспекты вывучэння музычнага фальклору ў кантэксце традыцый народнай культуры;

– асвятленне асноўных тэарэтычных канцэпцый у гістарычнай дынаміцы іх станаўлення і развіцця;

– асваенне выпрацаваных у айчыннай і замежнай навуцы метадаў даследавання народнай музыкі.

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны студэнты павінны *ведаць*:

– асноўныя кірункі, школы, метады і тэндэнцыі развіцця айчыннай і замежнай этнамузыкалогіі, асноўныя тэарэтычныя працы і публікацыі музычна-этнаграфічных матэрыялаў;

– асноўныя даследчыя праблемы ў галіне народнай традыцыйнай музычнай культуры: прыроду, мову, змест, форму, прызначэнне, функцыі музычнага фальклору ў кантэксце культурнай традыцыі;

– месца музычнага кампаненту ў структуры фальклорна-этнаграфічнага матэрыялу;

– метады вывучэння народнай музыкі;

– метады ўключэння народнай музыкі ў розныя формы адукацыйнай і канцэртна-асветніцкай дзейнасці.

*умець*:

– вызначаць асноўныя дыялектныя прыкметы народнай музычнай традыцыі (на лакальным ці рэгіянальным узроўнях);

– рабіць комплексны аналіз сродкаў мастацкай выразнасці фальклорна-этнаграфічнага матэрыялу;

– сістэматызаваць узоры народнай музыкі;

– карыстацца навуковай і даведачнай літаратурай па пытаннях дысцыпліны.

*валодаць*:

– методыкамі каталагізацыі народных песень і найгрышаў;

– методыкамі вызначэння кампазіцыйна-рытмічных заканамернасцей розных жанраў фальклору.

Засваенне вучэбнай дысцыпліны «Этнамузыкалогія» павінна забяспечыць фарміраванне спецыялізаванай кампетэнцыі: валодаць навыкамі сістэматызацыі ўзораў народнай музыкі, каталагізацыі народных песень і найгрышаў; вызначаць кампазіцыйна - рытмічныя заканамернасці музычных жанраў фальклора.

У адпаведнасці з вучэбным планам на вывучэнне вучэбнай дысцыпліны «Этнамузыкалогія» ўсяго адведзена 544 гадзіны, з іх – 320 гадзін аўдыторныя (100 гадзін – лекцыйныя, 200 гадзін – практычныя, 20 гадзін – семінарскія) заняткі

Рэкамендаваныя формы кантролю ведаў студэнтаў – залікі, экзамены.

# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

## Уводзіны

## Тэма 1. Паняцце этнамузыкалогіі. Гісторыя ўзнікнення тэрміна «этнамузыкалогія». Мэта і задачы дысцыпліны.

Паняцце этнамузыкалогіі, гісторыя ўзнікнення тэрміна «этнамузыкалогія». Прадмет і задачы вучэбнай дысцыпліны «Этнамузыкалогія». Музычны фальклор (этнічная музыка вуснай традыцыі) як частка нематэрыяльнай культурнай спадчыны Беларусі. Неабходнасць яго вывучэння і захавання.

## Тэма 2. Метады вывучэння народнай музыкі.

Метады структурнага, стылявога аналізу народнай музыкі. Параўнальныя метады даследавання народнай музыкі. Функцыянальны метад і яго прымяненне ў этнамузыкалогіі. Арэальны метад вывучэння традыцый вуснай музычеай культуры. Метады структурнага і стылявога аналізу народнай музыкі. Параўнальныя метады вывучэння народнай музыкі. Функцыянальны метад яго прымяненне ў этнамузыкалогіі. Арэальны метад вывучэння традыцый вуснай музычнай культуры. Метады сістэатызацыі і класіфікацыі музычнага фальклора. Удасканаленне факталагічнай базы навукі, эксперыментальныя метады ў этнамузыкалогіі. Адукацыйны, выхаваўчы, сацыякультурны аспекты этнамузыкалогіі.

## Тэма 3. Музычная мова і іншыя «мовы» традыцыйнай культуры.

Неабходнасць і спецыфіка перадачы ведаў ва ўмовах культуры вуснага тыпу. Сімвалічныя “мовы” народнай культуры, якія адрозніваюцца паміж сабой сродкамі перадачы інфармацыі, але маюць адзінае “поле” значэнняў. Рытуал і яго коды. Гукавы код народнай культуры. Функцыі гуку і голасу ў традыцыйнай культуры.

## Тэма 4. Спецыфіка музычнага фальклору.

Вуснасць, варыятыўнасць, калектыўнасць, полістадыяльнасць як фундаментальныя ўласцівасці музычнага фальклору. Музычна-фальклорная традыцыя (у т.л. лакальная). Культурны тэкст. Тэкст і кантэкст у музычным фальклоры.

## Тэма 5. Фарміраванне і развіццё сусветнй этнамузыкалогіі.

Развіццё этнаграфіі як навукі ў пачатку XIX ст. (Ж. Ж. Ампер). Узнікненне таварыстваў і этнаграфічных цэнтраў пры музеях у Парыжы, Стакгольме, Нью-Йорке, Чыкага і інш. гарадах. 1890-е гг. - актыўная палявая даследчая работа ў розных краінах. Акустычная школа А. Дж. Эліса (1880-я гг.). Узнікненне параўнальнага музыказнання на аснове навуковых работ К. Штумпфа і Дж. Эліса. Вынаходніцтва Дж.Эліса – фанограф і яго значэнне для неабходнасці ўзнікнення этнамузыкалогіі як асобнай навукі. З’яўленне

фанаграмархіваў у Заходняй Еўропе і Расіі і іх значэнне для развіцця этнамузыкалогіі. Тэорыя акультурацыі 1930-х гг. 1950 г. – увядзенне тэрміна “этнамузыкалогія” Я. Кунстам у сваёй рабоце «Musicologica». Тэрміны “параўнальнае музыказнанне” і “*музычная этнаграфія*” – сінонімы “этнамузыкалогіі” ў заходнееўрапейскім музыказнанні.

## Раздзел I. Беларуская этнамузыкалогія

### Тэма 6. Станаўленне беларускай этнамузыкалогіі як навукі у кантэксцк сусветнага музыказнаўства. Этапы развіцця.

Рамантычны этап (першыя 2/3 XIX ст.) як «перыяд накаплення навуковых сіл і матэрыялу». Недасканалая сістэмнасць і пэўная тэндэнцыйнасць публікацый. Прафесійны этап (апошняя 1/3 XIX ст. – 1917г.). Паўночна-заходні аддзел Расійскага геаграфічнага таварыства. Сістэмны дослед фальклору і “незалежныя” этнографы. Інтарэс грамадскасці да фальклору праз дзейнасць асветнікаў і публіцыстаў. Даваенны этап (1917г.-1940-я гг.) і яго супярэчлівасць: дзяржаўная падтрымка народазнаўства, але адначасова і – моцны кантроль. Палітыка беларусізацыі. Інстытут беларускай культуры, АН БССР. Арыентацыя на фундаментальную навуку. Дзейнасць А.Грыневіча і М.Гарэцкага, кампазітараў М.Чуркіна, А.Туранкова, М.Аладава. Даследаванні Я.Гіпіуса і З.Эвальд, пачатак дзейнасці Р.Шырмы і Г.Цітовіча. Страты, нанесеныя музыкалогіі рэпрэсіямі 1930-х гг. і Другой сусветнай вайной. Паслеваенны этап: станаўленне беларускай этнамузыкалогіі (1950-я гг. – канец XX ст.). Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН БССР. Дзейнасць Л.Мухарынскай, Л.Касцюкавец, Т.Якіменка, З.Мажэйка, В.Ялатава. Сістэматызаваныя выданні і фальклорныя зборы.

### Тэма 7. Працы польскіх і чэшскіх збіральнікаў і даследчыкаў беларускага музычнага фальклору.

Варшаўскае таварыства сяброў навук (1800г.) і яго сумесная з Віленскім універсітэтам праграма па вывучэнні помнікаў гісторыі і культуры беларусаў як рэакцыя на заняпад Рэчы Паспалітай. Беларускі музычны фальклор у польскіх выданнях XIX – пачатку XX ст. Перыядычныя выданні Варшавы і Вільні пра фальклор беларусаў. Сістэматычныя даследаванні Антрапалагічнай камісіі Польскай акадэміі навук (Кракаў). Дзейнасць М.Федэроўскага (1853-1923) па падрыхтоўцы і выданні збору «Люд беларускі». Музычныя фальклорныя зборы польскага этнографа О.Кольберга, чэшскага этнамузыколага Л.Кубы.

### Тэма 8. Беларуская этнамузыкалогія і пецярбургская школа акадэміка Асаф’ева.

Савецкае народазнаўства і мастацтвазнаўства 1930-х гг. Этнамузыкалогія як навука на мяжы мастацтвазнаўства, псіхалогіі і

гістарычнай сацыялогіі. Інтанацыйная тэорыя Б.Асаф'ева (1884–1949) як аснова даследаванняў навукоўцаў Пецярбургскай этнамузыкалагічнай школы. Разуменне фальклору (музыкі вуснай традыцыі) як творчага метаду, які адлюстроўвае тып культуры і жывую музычную мову («інтанацыйны слоўнік») эпохі і народа. Доўгачасовая праграма Б.У.Асаф'ева па збіранні, даследаванні, вучэбнай і выдавецкай дзейнасці ў галіне музычнага фальклору. Непасрэдныя вучні Асаф'ева Я.Гіпіус і З.Эвальд і іх даследаванні фальклору беларусаў.

**Тэма 9. Я. У. Гіпіус і яго значэнне для беларускай этнамузыкалогіі.**

Я. Гіпіус (1903-1985) – фальклярыст і даследчык народнай творчасці. Фанаграмархіў Інстытута антрапалогіі, этнаграфіі і археалогіі АН СССР, заснаваны Я.Гіпіусам як цэнтр вядучых этнамузыколаў краіны. Экспедыцыі па Гомельскаму Палессю і Падняпроўі, наладжаныя ў 1930-я гг. Я.Гіпіусам, З.Эвальд сумесна з М.Грынблатам (секцыя этнаграфіі і фальклору АН БССР) і пецярбурскім фальклярыстам Ф.Рубцовым. Дзейнасць гэтых даследчыкаў як прадумова фарміравання этнамузыкалогіі як адной з цэнтральных дысцыплін беларускай народазнаўчай навукі. Падрыхтоўка і выданне збораў «Песні беларускага народа» і «Белорусские народные песни» як сістэматызаванага адлюстравання даваеннай песеннай сістэмы Беларусі.

**Тэма 10. Беларускае адраджэнне пачатку XX ст. і народная музыка.**

Інтарэс беларускай грамадскасці да фальклору праз дзейнасць асветнікаў і публіцыстаў пачатку XX ст. Дзяржаўная падтрымка народазнаўства ў савецкі час, але і – моцны кантроль за ідэалогіяй. Палітыка беларусізацыі. Інстытут беларускай культуры, АН БССР. Арыентацыя на фундаментальную навуку і «адвакацкая функцыя» этнамузыколагаў па абароне фальклору і яго носьбітаў. Дзейнасць па збіранні і папулярызацыі фальклору этнамузыколага А. Грыневіча (1877-1937) і фальклярыста М. Гарэцкага (1893-1938), кампазітараў М.Чуркіна, А.Туранкова, М.Аладава.

**Тэма 9. Дзейнасць Р. Шырмы і Г. Цітовіча ў рэчышчы беларускай практычнай фальклярыстыкі XX ст.**

Р. Шырма (1892-1978) – асветнік, фальклярыст, музыка. Даследча-збіральніцкая праца ў Заходняй Беларусі. Віленскі перыяд дзейнасці Шырмы. Праца па стварэнні прэцэдэнтаў харавога руху на Беларусі. Неабгрунтаваныя рэпрэсіі і рэабілітацыя ў ваенны перыяд, канцэртная практыка на фронце. Гродзенскі перыяд дзейнасці як унёсак у фарміраванне нацыянальнай харавой адукацыі. Перыяд прызнання і актыўнай канцэртнай дзейнасці капэлы Шырмы ў 1950-1970-я гг. Чатырохтомнае выданне беларускіх песень як вынік шматгадовай даследчай і збіральніцкай дзейнасці.

Г. Цітовіч (1910-1982) – асветнік, фальклярыст, музыка. Удзел у хоры Шырмы ў Вільні, прафесійныя заняткі музыкай і фальклярыстыкай ў Заходняй Беларусі і прылеглых раёнах Польшчы. Праца з вясковымі

спеўнымі гуртамі Палесся і стварэнне Дзяржаўнага народнага хору ў Мінску (1952). Даследчая і выдавецкая дзейнасць па прапагандзе каранёвай музыкі беларусаў ва урбаністычным асяродзі. «Анталогія беларускай народнай песні» як фундаментальнае канцэптуальнае аўтарскае выданне. Жыццёвы шлях Цітовіча як прыклад станаўлення практычнай этнамузыкалогіі.

## Тэма 12. Этнамузыкалагічныя даследаванні ў Беларускай акадэміі музыкі

Дзейнасць этнамузыколагаў Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі як даследчыкаў, педагогаў, публіцыстаў, прапагандыстаў і палевікоў-практыкаў. Кабінет народнай музыкі, кафедра беларускай музыкі (1990). Тэматыка даследчых работ спецыялістаў-этнамузыколагаў БДАМ як адлюстраванне маштабнасці жыцця песенных форм фальклору Беларусі. Даследаванні выхаваных Л.Мухарынскай этнамузыколагаў Л. Касцюкавец і Т. Якіменка па кантавай культуры Беларусі, беларускіх песнях-баладах. Л. Мухарынская (1906–1987) – заснавальнік традыцый этнамузыкалагічных даследаванняў у Белдзяржкансерваторыі (Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі). Даследаванні па ладавай аснове народнай песні, пераемнасці ў развіцці музычнага фальклору. Выхад на даследаванне кардынальных асноў і законаў жыцця фальклору як падмурак уключэння этнамузыкалогіі ў кола фундаментальнага беларускага народазнаўства. Штогадовыя навуковыя чытанні памяці Л. Мухарынскай (з 1991 г.) як форум усходнееўрапейскіх этнамузыколагаў.

## Тэма 13. Этнамузыкалагічныя даследаванні ў НАН Беларусі 1960-90 гг.

Заснаванне ІМЭФ НАН Беларусі (1957) як сродак сістэматызацыі і канцэптуалізацыі збіральніцкай і навукова-даследчай работы з музычным фальклорам. Даследаванне ладавай і рытмічнай асновы беларускага фальклору В.Ялатавым (1923-1980), сістэмна-тыпалагічнай арганізацыі песнятворчасці З.Мажэйка, рэгіянальных асаблівасцяў фальклору Т.Варфаламеевай і Г.Таўлай. Фальклорныя зборы «Беларуская народная творчасць» (гал. рэд. А.Фядосік), «Песні рэгіёнаў» як сістэмная прэзентацыя музычнага фальклору ў відава-жанравай і рэгіянальнай перспектывах на падмурку мэтанакіраванага сплашнога даследавання этнакультурных рэгіёнаў. Дзейнасць этнамузыколагаў у галіне практычнай фалькларыстыкі (Этнаграфічныя канцэрты і антрапалагічныя фільмы З.Мажэйка, фестывалі фальклору).

## Тэма 14. Этнамузычныя даследаванні серыі «Традыцыйная мастацкая культура беларусаў» 1990-2000 гг.

Шасцітомная серыя ТМКБ – практычны вынік распрацоўкі навукова-даследчай тэмы Беларускага дзяржаўнага інстытута праблем культуры “Сучасны стан традыцыйнай мастацкай культуры белрусаў: даследаванне і практыка, якая пачалася ў рамках Праграмы дзяржаўнай падтрымкі

традыцыйнай культуры (1994-1996 гг.). Калектыў аўтараў (Т. Б. Варфаламеева, А. М. Боганева, Т. І. Кухаронак, М. А. Козенка, В. І. Лабачэўская, М. Ф. Раманюк і інш. ) ставіць асноўнай задачай комплексны паказ рэгіянальнага багацця і разнастайнасці ўсіх асноўных відаў традыцыйнай мастацкай культуры ў яе аўтэнтычных формах і паказ яе як актуальнай праявы, жывой традыцыі на мяжы II і III тысячагоддзяў.. У кожным томе асобная ўвага надзяляецца раздзелам “Каляндарныя і сямейныя звычаі і абрады”, “Пазаабрадавыя песні”, “Танцавальны фальклор”, “Інструментальная музыка”, “Народная проза”, “Народныя гульні” , а таксама “Народны касцюм” і “Традыцыйны народны тэкстыль”. Важнась збору ТМКБ ў вырашэнні праблем экалогіі традыцыйнай культуры і яе захавання.

**Тэма 15. Беларускае этнаінструментазнаўства**

Этнаінструментазнаўчы накірунак беларускай этнамузыкалогіі, які развівае з 1970-х гг. І.Назіна. Даследаванні жанравага складу, асаблівасцяў функцыянавання, стылявых рысаў музычна-інструментальнага фальклору. Характарыстыка сігнальных найгрышаў, гукавыяўленчых найгрышаў, песенных найгрышаў, танцавальных найгрышаў, маршаў, прапанаваная І.Назінай. Яе выданні па беларускіх народных інструментах. Калекцыя народных інструментаў, відэастужкі аб музыках і народных інструментах. Зварот да кагнітыўнага падыходу да інструментальнай традыцыйнай музыкі як працяг даследчага накірунку, закладзенага Н.Нікіфароўскім у творы «Дудар і Музыка». Праблема рэвіталізацыі каранёвых музычных інструментаў (дуды, колавай ліры, парных дудак) у XX ст.

## Раздзел II. Этнамузыкалагічны практыкум

**Тэма 16. Асновы натацыі традыцыйнай музыкі: Спецыфіка фальклорных выканальніцкіх прыёмаў і спосабы іх абазначэння**

Азнаямленне з простымі выканальніцкімі прыёмамі, вывучэнне спосабаў іх абазначэння (асваенне знакавай семантыкі). Пад'езды і спады. Глісанда. Гукі нявызначанай вышыні. Пэўныя і неазначальныя флажалеты. Завышэнне і прыніжэнне тону. Падыманне і апусканне тону. Фермата без кропкі і перавернутая фермата.

**Тэма 17. Асноўныя рытмічныя малюнкі народнай песні**

Бінарныя, трыёльныя, пункцірныя і сінкапіраванныя рытмічныя схемы. Шкала рытмічных пульсацый. Тыпы паўзаў.

**Тэма 18. Вызначэнне тэмпу ў традыцыйнай музыцы. Лад і танальнасць традыцыйнай музыкі**

Тэмп як адна з дынамічных характарыстык музычнай тканіны. Механічны і «жывы» тэмп. Тэмпавая ідэнтыфікацыя рытмічных цыклаў.

Метраном Мельцеля. Паскарэнне і запавольванне песні. Лад і танальнасць народнай песні. Вызначэнне ладу і танальнасці. «Падыманне» песні як адлюстраванне эмацыйнага тонусу.

**Тэма 19. Вызначэнне музычнай формы народнай песні**

Музычная страфа (куплет). Яе структура. Такт вышэйшага парадку. Метр і памер у фальклорнай музыцы.Тактыроўка народнай песні.

**Тэма 20. Упрыгожванні ў народных песнях. Мелізмы**

Віды мелізмаў. Песні з багаццем мелізматыкі: методыка натавання.

**Тэма 21. Народна-песенны верш. Музычная страфа. Афармленне натацыі**

Музычная строфіка народна-песеннага верша. Дыялектныя асаблівасці народна-песеннага верша. Адлюстраванне дыялектнай фанетыкі ў падтэкстоўцы. Стандартная форма (фармат) натацыі. Пашпарт песні.

**Тэма 22. Асновы літаратурнага аналізу народных песень: Народна-песенная паэзія.**

Адрозненне паэзіі ад прозы. Верш як паэтычная адзінка. Народна-песенны верш. Чысты верш. Музычная строфіка. Тыпы вершу ў фальклоры і ў тэорыі літаратуры. Танічны верш. Сілабічны верш. Сілаба-танічны (стопны) верш і яго віды.

**Тэма 23. Тыпы фальклорнага вершу. Сюжэт і кампазіцыя вершу. Родавыя і жанравыя разнавіднасці народна-песеннага вершу**

Роды і жанры народна-песеннага вершу. Эпас. Эпічныя жанры. Лірыка. Лірычныя жанры. Ліра-эпічныя жанры фальклору. Жанравае дзяленне народных песень. Сюжэт і кампазіцыя верша. Асноўныя кампазіцыйныя прыёмы (апавяданне, апісанне, ступеністае звужэнне вобразаў і інш.) Сродкі мастацкай выразнасці фальклору. Алегорыя. Асноўныя сродківыразнасці народна-песеннага верша: метафара, эпітэт, гіпербала, параўнанне, іронія. Сімволіка народнай песні.

**Тэма 31. Музычная страфа і куплет. Рытма-складовая формула верша**

Музычная страфа і куплет. Куплетна-прыпеўная форма. Формула вершу. Формула напеву. Суадносіны формулы верша з формулай напеву. Вызначэнне рытма-складовай формулы верша. Прынцыпы і правілы, неабходныя для складання рытма-складовай формулы верша.

**Тэма 25. Асаблівасці дыялекту народных песень**

Дзяленне мовы на прыслоўі і гаворкі. Гаворка і манера спеваў выканаўцы. Дыялектныя словы. Дыялектныя формы слоў.

## Раздзел III. Асноўныя мелодыка-рытмічныя тыпы беларускіх народных абрадавых песень і арэалы іх бытавання

### Тэма 26. Тыпавыя напевы абыходных калядных і валачобных песень.

Песні зімовага сонцастаяння, іх функцыянальная прыналежнасць, месца ў абрадзе. Разнастайнасць калядных песенных традыцый на Беларусі. Асноўныя прыкметы і арэалы бытавання сямі калядных тыпаў напеваў, а таксама калядных і шчадроўных заклічак і двух калядна-гульнявых тыпаў : “Каза” і “Цярэшка”.

Месца валачобных песень у агульнай семантыцы веснавых напеваў. Асноўныя прыкметы і арэалы бытавання чатырох валачобных тыпаў напеваў. Падабенства структурных прыкмет калядных і валачобных абыходных віншавальных песень, але адрозненні ў іх эмацыйным насычэнні (карнавалізацыя калядак і строгая ўрачыстасць валачобных).

### Тэма 27. Тыпавыя напевы веснавых загуканняў

Тыпалагічны шэраг песень – веснавых загуканняў (IV асноўныя мелодыка-рытмічныя тыпы), іх этнафанічныя прыкметы і арэалы бытавання.

### Тэма 28. Тыпавыя напевы юраўскіх, траецкіх, русальных, кустывых і талочных веснавых песень

Асноўныя прыкметы і арэалы бытавання пералічаных тыпаў веснавых напеваў.

### Тэма 29. Асноўныя рытма-інтанацыйныя структуры веснавых карагодаў

Тыпалагічны шэраг і інтанацыйнасць веснавых карагодаў, іх асноўныя харэагрфічныя віды. Мелодыка-рытмічныя прыкметы карагодаў тыпа “Проса”, “Страла”, “Володар”, “Лука” і арэалы іх бытавання.

### Тэма 30. Тыпавыя напевы купальскіх песень

Песні летняга сонцастаяння, іх функцыянальны і абрадавы кампаненты. Устойлівыя прыкметы дзевяці тыпаў купальскіх напеваў і іх арэальная прыналежнасць.

### Тэма 31. Тыпавыя напевы жніўнага песеннага комплекса

Абрадавыя і працоўныя песні перыяду жніва. Прыкметы дзвюх тыпалагічных груп уласна жніўных напеваў і двух мелодыка-рымічных тыпаў дажынкавых. Арэалы іх бытавання.

### Тэма 32. Тыпавыя напевы песень восені

Песні восені, іх адметнасці і этнафанічныя асаблівасці. Тыпы ярынных, аўсяных, ільняных і ўласна восеньскіх напеваў і іх арэалы.

### Тэма 33. Тыпавыя напевы вясельных песень

Вяселле – самая шматстастаўная дзея, мнагаактная народная опера ў традыцы беларусаў. Адпаведнасць вясельных песень кожнай абрадавай дзеі. Тыпавыя напевы вясельных песень, іх асаблівасці і арэалы бытавання.

### Тэма 34. Тыпавыя напевы хрэсьбінных песень

Абрад хрэсьбінаў. Віцебскае Падзвінне – адзіны рэгіён, дзе выконваюцца спецыяльныя абрадавыя палітэкставыя напевы і суправаджаюць усе этапы рытуалу, на астатняй тэрыторыі Беларусі бытуюць пазаабрадавыя (бяседныя) песні, якія адпавядаюць сутнасці абраду. Устойлівыя прыкметы тыпавых хрэсьбінных напеваў.

### Тэма 35. Мелаінтанацыйныя асаблівасці галашэнняў

Жанр галашэнняў і ўмовы яго бытавання. Пахавальныя галашэнні, галашэнні нявесты-сіраты на могілках. Арэалы і мелаінтанацыйныя асаблівасці.

# ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА

вучэбнай дысцыпліны

| Нумар тэмы | Назва тэмы, раздзелу | Колькасць аўдыторных гадзін | | | | Форма кантролю заняткаў |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | Лекцыйныя | Практычныя | Сенмінарскія | КСР | |
| **Уводзіны.** | | | | | | |
| 1 | Паняцце этнамузыкалогіі. Гісторыя ўзнікнення тэрміна “этнамузыкалогія”. Мэта і задачы дысцыпліны. | 4 | | | 2 | апытванне |
| 2 | Метады вывучэння народнай музыкі. | 2 | | | | |
| 3 | Музычная мова і іншыя “мовы” традыцыйнай культуры. Тэорыя кантанацыі | 2 | | | | |
| 4 | Спецыфіка музычнага фальклору | 2 | | | | |
| 5 | Фарміраванне і развіццё сусветнй этнамузыкалогіі. | 4 | | | 2 | апытванне |
| **Раздзел І. Беларуская этнамузыкалогія** | | | | | | |
| 6 | Станаўленне беларускай этнамузыкалогіі як навукі у кантэксце сусветнага этнамузыказнаўства. Этапы развіцця | 6 | | 4 | 2 | апытванне |
| 7 | Працы польскіх і чэшскіх збіральнікаў і даследчыкаў беларускага музычнага фальклору | 2 | | 4 | 2 | апытванне |
| 8 | Беларуская этнамузыкалогія і пецярбургская школа акадэміка Асаф`ева | 2 | | 4 | 2 | апытванне |
| 9 | Я. Гіпіус і яго значэнне для беларускай этнамузыкалогіі | 2 | | 4 | 2 | апытванне |
| 10 | Беларускае адраджэнне пачатку XX ст. і народная музыка. | 2 | 4 | | 2 | апытванне |
| 11 | Дзейнасць Р. Шырмы і Г. Цітовіча ў рэчышчы беларускай практычнай фалькларыстыкі XX ст. | 2 | 4 | | 2 | апытванне |
| 12 | Этнамузыкалагічныя даследаванні ў Беларускай акадэміі музыкі | 2 | 4 | | 2 | апытванне |
| 13 | Этнамузыкалагічныя даследаванні ў НАН Беларусі 1960-90 гг. | 2 | 4 | | 2 | апытванне |

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 14 | Этнамузычныя даследаванні серыі «Традыцыйная мастацкая культура беларусаў» 1990-2000 гг. | 2 | 4 | | 2 | апытванне |
| 15 | Беларускае этнаінструментазнаўства | 2 | 6 | | 2 | Апытанне |
| **Раздзел II. Этнамузыкалагічны практыкум** | | | | | | |
| 16 | Асновы натацыі традыцыйнай музыкі: Спецыфіка фальклорных выканальніцкіх прыёмаў і спосабы іх абазначэння | 2 | 4 | | 2 | апытванне |
| 17 | Асноўныя рытмічныя малюнкі народнай песні | 2 | 4 | | 2 | апытванне |
| 18 | Вызначэнне тэмпу ў традыцыйнай музыцы. Лад і танальнасць традыцыйнай музыкі | 2 | 4 | | 2 | апытванне |
| 19 | Вызначэнне музычнай формы ў традыцыйнай музыцы | 2 | 4 | | 2 | апытванне |
| 20 | Упрыгожванні ў народных песнях. Мелізмы | 2 | 4 | | 2 | апытванне |
| 21 | Народна-песенны верш. Музычная страфа. Афармленне натацыі | 2 | 4 | | 2 | Апытванне |
| 22 | Асновы літаратурнага аналізу народных песень: Народна-песенная паэзія. | 2 | 4 | | 2 | апытванне |
| 23 | Тыпы фальклорнага вершу. Сюжэт і кампазіцыя вершу. Родавыя і жанравыя разнавіднасці народна-песеннага вершу | 2 | 4 | | 2 | апытванне |
| 24 | Музычная страфа і куплет. Рытма-складовая формула верша | 2 | 4 | | 2 | апытванне |
| 25 | Асаблівасці дыялектаў народных песень | 2 | 4 | | 2 | апытванне |
| **Раздзел III. Асноўныя мелодыка-рытмічныя тыпы беларускіх народных абрадавых песень і арэалы іх бытавання** | | | | | | |
| 26 | Тыпавыя напевы абыходных калядных і валачобных песень. | 4 | 12 | | 2 | Сдача напеваў, табліца ўстойлівых прыкмет тыпавых напеваў |
| 27 | Тыпавыя напевы веснавых загуканняў | 2 | 6 | | 2 | Сдача напеваў, табліца ўстойлівых прыкмет тыпавых напеваў |
| 28 | Тыпавыя напевы юраўскіх, траецкіх, русальных, куставых і талочных веснавых песень | 2 | 12 | | 2 | Сдача напеваў, табліца ўстойлівых прыкмет тыпавых напеваў |
| 29 | Асноўныя рытмаі-інтанацыйныя структуры веснавых карагодаў | 2 | 6 | | 2 | Сдача напеваў, табліца ўстойлівых прыкмет тыпавых напеваў |

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 30 | Тыпавыя напевы купальскіх песень | 2 | 12 | | 2 | Сдача напеваў, табліца ўстойлівых прыкмет тыпавых напеваў |
| 31 | Тыпавыя напевы жніўнага песеннага комплекса | 2 | 12 | | 2 | Сдача напеваў, табліца ўстойлівых прыкмет тыпавых напеваў |
| 32 | Тыпавыя напевы песень восені | 2 | 12 | | 2 | Сдача напеваў, табліца ўстойлівых прыкмет тыпавых напеваў |
| 33 | Тыпавыя напевы вясельных песень | 2 | 12 | | 4 | Сдача напеваў, табліца ўстойлівых прыкмет тыпавых напеваў |
| 34 | Тыпавыя напевы хрэсьбінных песень | 2 | 8 | | 2 | Сдача напеваў, табліца ўстойлівых прыкмет тыпавых напеваў |
| 35 | Мелаінтанацыйныя асаблівасці галашэнняў | 2 | 2 | | | апытанне |
| | **Усяго:** | **80** | **160** | **16** | **64** | |

# 1. ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ РАБОТА

## Літаратура

*Асноўная*

*1.* Белорусская этномузыкология: Очерки истории (XIX–XX вв.) / [З. Можейко и др.] ; под ред. З. Можейко. – Минск: Тэхналогія, 1997. – 251, [5] с. : нот.

*2.* Можейко, З.Я. Календарно-песенная культура Белоруссии : опыт системно-типологического исследования / З. Я. Можейко. – Минск: Наука и техника, 1985. – 245, [2] с. : нот.

*3.* Мухарынская, Л. Беларуская народная музычная творчасць : вучэб. дапам. для студэнтаў вышэйшых музычных навучальных устаноў / Л. С. Мухарынская, Т. С. Якіменка. – Мінск : Вышэйшая школа; 1993. – 343, [1] с. : нот.

*Дадатковая*

*1. Азадовский, М.К.* История русской фольклористики. М.: Учпедгиз, 1958. Т. 1. – 479 с.; 1963. Т.2. – 363 с.

*2. Анализ* вокальных произведений. Учеб. пособие / Под ред. О. Коловского. – Л.: Музыка, 1988. – 352 с.: нот.

*3. Асафьев, Б.В.* Музыкальная форма как процесс. 2-е изд. – М.: Музыка, 1971. – 376 с.

*4. Асафьев, Б.В.* Речевая интонация / Под ред. Е.М. Орловой. – М.; Л.: Музыка, 1965. – 136 с.: нот.

*5. Банин, А. А.* Слово и напев. Проблемы аналитической текстологии // Фольклор. Образ и поэтическое слово в контексте / Отв. ред. В.М. Гацак. М.: Наука, 1984. С. 170–202.

*6. Банин, А.А.* К изучению русского народно-песенного стиха. Методологические заметки // Фольклор. Поэтика и традиция / Отв. ред. В.М. Гацак. М.: Наука, 1982. С. 94–139.

*7. Банин, А.А.* Метод морфологического описания произведений фольклора // Методы изучения фольклора: Сб. науч. тр. Л., 1983. С. 80–95.

*8. Банин, А.А.* О принципах моделирования обобщенного слогоритма. Вопросы методики и методологии // Памяти К.В. Квитки: Сб. ст. / Ред.-сост. А. Банин. М.: Сов. композитор, 1983. С. 165–179.

*9. Банин, А.А.* Об одном аналитическом методе музыкальной фольклористики // Музыкальная фольклористика / Ред.-сост. А.А. Банин. М.: Сов. композитор, 1978. Вып. 2. С. 117–157.

*10. Богатырев, П.Г.* Вопросы теории народного искусства. – М.: Искусство, 1971. – 544 с.

*11. Варфоломеева, Т.Б.* Северо-белорусская свадьба. Обряд, песенно-мелодические типы. – Минск: Наука и техника, 1988. – 158 с.: нот.

*12.* Восточнославянский фольклор: Словарь научной и народной терминологии / Под ред. В.Е. Гусева, В.М. Гацак; Отв. ред. К.П. Кабашников. – Минск: Навука і тэхніка, 1993. – 478 с.

*13.* *Гилярова, Н.Н.* К проблеме преподавания музыкального фольклора в вузе. Этномузыкальный аспект образования // Психология музыкальной деятельности: Учеб. пособие. М.: Academia, 2003. С. 303-317.

*14.* *Гилярова, Н.Н.* Морозов И.А., Слепцова И.С. К вопросу о методике комплексного изучения локальной традиции. Шацкий этнодиалектный словарь // Этнографическое обозрение. 1999. № 1. С. 41–66.

*16.* *Гилярова, Н.Н.* Идеи Е. Линевой и современные методы этномузыковедческого исследования // По следам Е.Э. Линевой: сборник научных статей. Вологда: Изд-во обл. науч.-метод. центра культуры и повышения квалификации, 2002. С. 5–14.

*17.* *Гошовский, В.Л.* У истоков народной музыки славян: Очерки по музыкальному славяноведению. – М.: Сов. композитор, 1971. – 304 с.: нот.

*18.Гусев, В.Е.* Эстетика фольклора. – Л.: Наука, 1967. – 318 с.

*19.* *Елатов, В.И.* Ладовые основы белорусской народной музыки. – Минск: Наука и техника, 1964. – 216 с.: нот.

*20.* *Елатов, В.И.* Мелодические основы белорусской народной музыки. – Минск: Наука и техника, 1970. – 143 с.: нот.

*21.* *Елатов, В.И.* Ритмические основы белорусской народной музыки. – Минск: Наука и техника, 1966. – 220 с.: нот.

*22.Земцовский, И.И.* Мелодика календарных песен. – Л.: Музыка, 1975. – 224 с.: нот

*23.* *Коргузалов, В.В.* Генетические предпосылки жанровой классификации музыкального фольклора // Русский фольклор. Л.: Наука, 1975. Т. 15. С. 240–273.

*24.* *Мазель, Л.А.* О системе музыкальных средств и некоторых принципах художественного воздействия музыки // Интонация и музыкальный образ: Ст. и исслед. / Под общ. редакцией Б.М. Ярустовского. М.: Музыка, 1965. С. 225–263.

*25.Михайлов, М.* Стиль в музыке. – Л.: Музыка, 1981. – 264 с.

*26.* *Мухаринская, Л.* К вопросу об эстетическом освоении действительности в современном белорусском народно-песенном творчестве. Исследование. – Л.: Сов. композитор, 1982. – 78 с.: нот.

*28.* *Мухаринская, Л.И.* Белорусская народная песня. Историческое развитие. – Минск: Наука и техника, 1977. – 216 с.: нот.

*29.* *Назіна, І.Д.* Беларускія народныя музычныя інструменты. – Мінск: Беларусь, 1997. – 239 с.: нот.

*30.* *Орлова, Е.М.* Интонационная теория Асафьева как учение о специфике музыкального мышления. История. Становление. Сущность. – М.: Музыка, 1984. – 302 с.

31. *Пашина, О.А.* Ареальный аспект соотношения функции и структуры музыкально-фольклорных текстов // Славянские этюды: (Сборник к юбилею С.М. Толстой). М.: Индрик, 1999. С. 331–339.

32. *Пашина, О.А.* Календарно-песенный цикл у восточных славян / Гос. ин-т искусствознания. – М., 1998. – 292 с.

33. *Путилов, Б.Н.* Методология сравнительно-исторического изучения фольклора. – Л.: Наука, 1976. – 245 с.

34. *Рубцов, Ф.А.* Интонационные связи в песенном творчестве славянских народов: Опыт исследования. – Л.: Сов. композитор, 1962. – 116 с.: нот.

35. *Рубцов, Ф.А.* Статьи по музыкальному фольклору. – Л.; М.: Сов. композитор, 1973. – 224 с.: нот.

36. *Руднева, А.В.* Русское народное музыкальное творчество: Очерки по теории фольклора / Ред-сост. Н.Н. Гилярова, Л.Ф. Костюковец. – М.: Композитор, 1994. – 223 с.: нот.

37. *Савельева, Н.М.* О региональных и локальных разновидностях типовых русских песенных структур // Проблемы композиции народной песни. М., 1997. С. 41–47. (Науч. тр. Моск. гос. консерватории; Сб. 10).

38. *Смоленский* музыкально-этнографический сборник / Отв. ред. О.А. Пашина. – М.: Индрик, 2003. Т. 1: Календарные обряды и песни. – 760 с.: нот.; Т. 2: Похоронный обряд. Плачи и поминальные стихи. – 550 с.: нот.

39. *Тавлай, Г.В.* Белорусское купалье: Обряд, песня. – Минск: Наука и техника, 1986. – 174 с.: нот.

40. *Толстой, Н.И.* Язык и народная культура. Очерки по славянской мифологии и этнолингвистике. 2-е изд., испр. / Сост. С.М. Толстая; Отв. ред. А.Ф. Журавлев. – М.: Индрик, 1995. – 512 с.

41. *Традыцыйная мастацкая культура беларусаў.* У 6 т. Т.1. Магілёўскае Падняпроўе / Т. Б. Варфаламеева, В. І. Басько, М. А. Козенка і інш. — Мінск: Бел. навука, 2001. — 797 с.

42. *Традыцыйная мастацкая культура беларусаў.* У 6 т. Т.2. Віцебскае Паддзвінне / Т. Б. Варфаламеева, А. М. Боганева, М. А. Козенка і інш.; Складальнік Т. Б. Варфаламеева. — Мінск: Бел. навука, 2004. — 910 с.

43. *Традыцыйная мастацкая культура беларусаў.* У 6 т. Т.3. Гродзенскае Панямонне. У 2-х кн. Кн. 1 / В. І. Басько [і інш.]; аўт. Ідэі Т, Б. Варфаламеева; агул. рэд. Т. Б. Варфаламеевай. — Мінск: Выш. шк., 2006. — 608 с.

44. *Традыцыйная мастацкая культура беларусаў.* У 6 т. Т.3. Гродзенскае Панямонне. У 2-х кн. Кн. 2 / А. М. Боганева [і інш.]; аўт. Ідэі Т, Б. Варфаламеева; агул. рэд. Т. Б. Варфаламеевай. — Мінск: Выш. шк., 2006. — 736 с.: каляр. іл.

45. *Традыцыйная мастацкая культура беларусаў.* У 6 т. Т. 4. Брэсцкае Палессе. У 2 кн. Кн. 1 / В. І. Басько [і інш.]; ідэя і агульнае рэдагаванне Т.Б. Варфаламеевай. — Мінск: Выш. шк., 2008. — 559 с. : каляр. іл.

46. *Традыцыйная мастацкая культура беларусаў.* У 6 т. Т. 4. Брэсцкае Палессе. У 2 кн. Кн. 2 / А. М. Боганева [і інш.]; ідэя і агульнае рэдагаванне

Т.Б. Варфаламеевай. — Мінск: Выш. шк., 2009. — 863 с. : каляр. іл., 1 электрон.-апт. дыск (CD-Rom).

47. *Традыцыйная мастацкая культура беларусаў.* У 6 т. Т. 5. Цэнтральная Беларусь. У 2 кн. Кн. 1 / В. І. Басько [і інш.]; ідэя і агульнае рэдагаванне Т.Б. Варфаламеевай. — Мінск: Выш. шк., 2010. — 847 с. : каляр. іл.

48. *Традыцыйная мастацкая культура беларусаў.* У 6 т. Т. 5. Цэнтральная Беларусь. У 2 кн. Кн. 2 / А. М. Боганева [і інш.]; ідэя і агульнае рэдагаванне Т.Б. Варфаламеевай. — Мінск: Выш. шк., 2011. — 911 с. : каляр. іл.

49. *Традыцыйная мастацкая культура беларусаў.* У 6 т. Т. 6. Гомельскае Палессе і Падняпроўе. У 2 кн. Кн 1 / Т. В. Валодзіна [і інш.]; ідэя і агул. Рэдагаванне Т. Б. Варфаламеевай. – Мінск: Выш. Шк., 2012. – 910 с.: каляр. іл.

50. *Традыцыйная мастацкая культура беларусаў.* У 6 т. Т. 6. Гомельскае Палессе і Падняпроўе. У 2 кн. Кн 2 / А. М. Боганева [і інш.]; ідэя і агул. Рэдагаванне Т. Б. Варфаламеевай. – Мінск: Выш. Шк., 2013. – 1231 с.: каляр. іл. + 1 электрон.-апт. дыск (CD-Rom).

51. *Христиансен, Л.Л.* Ладовая интонационность русской народной песни: Исследование. – М.: Сов. композитор, 1976. – 390 с.: нот.

52. *Чекановска, А.* Музыкальная этнография: Методология и методика / Пер. с польск. Г.Д. Блейза. – М.: Советский композитор, 1983. – 190 с.: нот.

53. *Щуров, В.М.* Стилевые основы народной музыки / Моск. гос. консерватория. – М., 1998. – 466 с.: нот.

54. *Щуров, В.М.* Южнорусская песенная традиция. Исследование. – М.: Сов. композитор, 1987. – 320 с.: нот.

55. *Эвальд З. В.* Социальное переосмысление жнивных песен белорусского Полесья // Советская этнография. 1934. № 5. - С. 17-39.

56. *Эльшекова, А.* Об изучении ранних форм славянской народной музыки // Славянский музыкальный фольклор. Статьи и материалы. М.: Музыка, 1972. С. 114–125.

## Метады навучання

Метады навучання ў рамках дадзенай вучэбнай дысцыпліны адпавядаюць агульным патрабаванням да фарміравання прафесійных кампетэнцый студэнта. Метадычнымі асновамі дысцыпліны з'яўляюцца: тлумачальна-ілюстратыўныя, рэпрадукцыйныя метады (апавяданне, тлумачэнне, гутарка, дыскусія, лекцыя, дэманстрацыя кіна- і аўдыёзапісаў, палявых відэазапісаў аўтэнтычных абрадаў, метад слыхавога пераймання ў працэсе актуалізацыі фальклорнай спадчыны), праблемныя (творчы дыялог, вопыт, назіранне, эксперымент), метады самастойнай работы студэнтаў (работа з першакрыніцамі, расшыфроўка паэтычных тэкстаў аўдыё- і відэаматэрыялаў), кантрольна-ацэначныя метады (адказы на семінарах, практыкаванні).

## Пералік рэкамендуемых сродкаў дыягностыкі

Для дыягностыкі прафесійных кампетэнцый, выяўлення ўзроўню засваення ведаў і ўменняў па дысцыпліне рэкамендаваны наступны інструментарый:

– падрыхтоўка прэзентацый;
– падрыхтоўка пісьмовых кантрольных работ (заданняў);
– напісанне рэфератаў па асобных раздзелах дысцыпліны;
– напісанне дакладаў на навуковыя канферэнцыі па асобных тэмах дысцыпліны;
– вуснае апытанне студэнтаў на семінарах па распрацаваных тэмах.

## Метадычныя рэкамендацыі па арганізцыі і выкананні самастойнай работы студэнтаў

Выкананне самастойнай работы па дысцыпліне прадугледжана тэматычнымі планамі і абавязкова для кожнага студэнта.

Самастойная работа выконваецца ў любой рэкамендаванай форме па адной з тэмаў, якія прыведзеныя ніжэй. Яна павінна мець тытульны ліст, асноўную частку і спіс літаратуры.

Тэматыка самастойнай работы з'яўляецца абавязковай, але студэнт мае права звузіць ці пашырыць абраную тэму. Пры напісанні работы можна выкарыстоўваць літаратуру па курсу.

**Формы выканання самастойнай работы:**

– Напісанне рэферату (не менш 12 старонак);
– Распрацоўка візуальнай прэзентацыі (не менш 12 слайдаў);
– Распрацоўка аўдыёвізуальнай прэзентацыі (не карацей за 2 хвіліны дэманстрацыі);
– Падрыхтоўка творчага нумару па тэме (сольнага ці дуэтам за 2 хвіліны дэманстрацыі).

Прыкладныя тэмы для самастойнай работы:

1. Дзеячы нацыянальных музычна-этнаграфічных школ Еўропы пачатку XX ст.
2. Даследчая і музычная дзейнасць Р.Шырмы
3. Даследчая і музычная дзейнасць Г.Цітовіча
4. Даследчая і педагагічная дзейнасць Л.Мухарынскай
5. Асноўныя накірункі этнамузыкалагічных даследаванняў у Беларускай акадэміі музыкі
6. Дзейнасць прадстаўнікоў беларускага этнаінструментазнаўства
7. Дзейнасць даследчыкааў у галіне беларускай аўдыёвізуальнай антрапалогіі

**Крытэрыі ацэнкі вынікаў вучэбнай дзейнасці студэнтаў**

Ацэнка і вызначэнне ўзроўню ведаў і прафесійных кампетэнцый студэнтаў ажыццяўляецца з дапамогай 10-бальнай шкалы: 10 (дзесяць), 9 (дзевяць), 8 (восем), 7 (сем), 6 (шэсць), 5 (пяць), 4 (чатыры), 3 (тры), 2 (два), 1 (адзін). Дастатковы ўзровень ведаў, уменняў і навыкаў ацэньваецца адзнакай, не меншай за 4 (чатыры) балы. Балы 1 (адзін), 2 (два), 3 (тры) з’яўляюцца нездавальняючай ацэнкай і недастатковай для далейшага працягу навучання, яны не забяспечваюць дастатковы аб’ём ведаў і кампетэнцый у межах адукацыйнага стандарта. Балы 1 (адзін), 2 (два), 3 (тры) не выстаўляюцца ў заліковую кніжку, толькі ў экзаменацыйную ведамасць.

Пры распрацоўцы наступных крытэрыяў ацэнкі выкарастаны тыпавыя крытэрыі вынікаў вучэбнай дзейнасці, распрацаваныя Міністэрствам адукацыі Рэспублікік Беларусь.

| Адзнака | Паказальнікі адзнакі |
|---|---|
| 1 (адзін) | Веданне студэнтам асобных фактаў, з’яў і тэрмінаў вывучаемай дысцыпліны. |
| 2 (два) | Устойлівая фіксацыя ў памяці студэнта асобных фактаў, з’яў і тэрмінаў вывучаемай дысцыпліны. |
| 3 (тры) | Аднаўленне студэнтам часткі праграмнага матэрыялу па памяці. Ізаляванасць ведаў па асобных тэмах, персаналіях, крыніцах. |
| 4 (чатыры) | Недастаткова сістэмнае ўсведамленне студэнтам вывучаемай дысцыпліны (ролі і месца ВНУ ў дзейнасці сучасных устаноў сацыякультурнай сферы, шляхоў і сродкаў засваення фальклору). Веданне даследчай і навукова-метадычнай літаратуры. |
| 5 (пяць) | Усведамленне большай часткі праграмнага вучэбнага матэрыялу (апісанне праблемнага поля адукацыи щ ВНУ), веданне структуры аналізу навучання. Наяўнасць неістотных памылак. |
| 6 (шесць) | Сістэмнае ўсведамленне большай часткі праграмнага вучэбнага матэрыялу. Веданне асноўнай навуковай літаратуры і метадычнага фонду па дысцыпліне. Наяўнасць неістотных памылак. |

| Адзнака | Паказальнікі адзнакі |
|---|---|
| 7 (сем) | Поўныя, трывалыя веды. Разгорнутае апісанне і тлумачэнне аб'ектаў вывучэння, раскрыццё праблемадукацыі ў ВНУ, фармуліроўка высноў. Уменне аналізаваць вучэбны працэс. Наяўнасць адзінкавых неістотных памылак. |
| 8 (восем) | Поўныя, трывалыя, глыбокія веды. Свабоднае аперыраванне вучэбным матэрыялам дысцыпліны. Раскрыццё сутнасці тэарэтычных пытанняў, пацвярджэнне аргументамі і фактамі. Веданне асноўнай і дадатковай літаратуры па дысцыпліне. Наяўнасць адзінкавых неістотных памылак. |
| 9 (дзевяць) | Усведамленне студэнтам працэсаў сацыяльна-карыснага выкарыстання адукацыі і веданне інавацыйных шляхоў і сродкаў яе ўдасканалення, асэнсаванне досведу па эстэтычнаму аздабленню навучання. Раскрыццё сутнасці тэарэтычных пытанняў, пацвярджэнне аргументамі і фактамі. Уменне аналізаваць структуру вучэбнага працэсу, карыстацца навукова-метадычнай літаратурай па акрэсленых пытаннях. Наяўнасць адзінкавых неістотных памылак. |
| 10 (дзесяць) | Глыбокае асэнсаванне праблем арганізацыі вучэбнага працэсу ў ВНУ як навуковай галіны. Разуменне студэнтам агульнатэарэтычных пытанняў адукацыі ў ВНУ на сучасным этапе. Уменне прымяняць свае веды ў кантэксце прафесійнай дзейнасці, аналізаваць з'явы традыцыйнай духоўнай культуры з улікам набытых ведаў, карыстацца навуковай літаратурай па эстэтыцы і экалогіі культуры, праблемах і тэндэнцыях этнамастацкай адукацыі. |